*Т.С. ЮХНАВЕЦ*

# МАДЭЛІ КААРДЫНАЦЫІ ФАРМІРАВАННЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ БІБЛІЯТЭК У ЗАМЕЖНЫХ КРАІНАХ

*Разглядаюцца мадэлі каардынацыі фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк шэрага вядучых замежных краін у XX ст. і напачатку XXI ст. Адзначаюцца як станоўчыя, так і негатыўныя з пункту гледжання задавальнення інфармацыйных патрэб карыстальнікаў бібліятэк бакі мадэляў, а таксама наяўнасць падобных арганізацыйных, тэхналагічных і змястоўных аспектаў каардынацыі фарміравання інфармацыйных рэсурсаў у бібліятэках розных краін. Вызначаюцца тэрытарыяльныя ўзроўні каардынацыі. На аснове выяўленых асаблівасцей мадэляў робяцца вывады аб іх тыпавой прыналежнасці.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэкі замежных краін маюць вялікі вопыт па каардынацыі дзейнасці бібліятэк у галіне фарміравання інфармацыйных рэсурсаў. Аб гэтым сведчаць публікацыі І.Балдзінай [2], С.Мірнага [3], В.Оськінай [4], В.Амундсена [6], Н.Элдэра [7], С.Філона [8] і інш. Вынікі вывучэння дадзеных матэрыялаў дазваляюць зрабіць вывад аб тым, што ў кожнай краіне каардынацыя фарміравання інфармацыйных рэсурсаў з пачатку развіцця набывала сваю спецыфіку ў залежнасці ад гістарычных, палітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых асаблівасцей краіны, якая, у сваю чаргу, паўплывала на фарміраванне мадэлі арганізацыі і ажыццяўлення каардынацыі. Аўтары ў сваіх працах да- статкова падрабязна (прыводзяць разнапланавыя статыстычныя паказчыкі, раскрываюць структуру планаў каардынацыі і інш.) разглядаюць арганізацыйна-тэхналагічныя пытанні каардынацыі ў пэўны перыяд часу, раскрываюць яе станоўчыя і негатыўныя бакі. Але апошняе тычыцца не ўсіх аўтараў. Акрамя таго, аб’ектам вывучэння для спецыялістаў з’яўляецца праблема каардынацыі дзейнасці бібліятэк толькі пэўнай краіны, у выніку чаго ў работах адсутнічаюць элементы параўнальнага аналізу вопыту каардынацыі ў бібліятэках розных краін, што абмяжоўвае іх практычную і тэарэтычную значнасць.

Мэтай артыкула з’яўляюцца вылучэнне агульных і адметных рыс у арганізацыі каардынацыі фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк шэрага вядучых замежных краін (ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Аўстраліі і інш.), фармуліроўка мадэляў каардынацыі і вызначэнне іх тыпу на пачатковым і сучасным этапах.

Атрыманыя вынікі даюць магчымасць павысіць эфектыўнаць і рацыяналізаваць дзейнасць бібліятэк Рэспублікі Беларусь па каардынацыі фарміравання інфармацыйных рэсурсаў, а таксама ўдасканаліць тэарэтычную распрацоўку дадзенай праблемы.

У ЗША каардынацыя дзейнасці бібліятэк у галіне фарміравання фондаў пачала развівацца пасля другой сусветнай вайны, калі стала відавочным, што эфектыўнасць узаемавыкарыстання фондаў залежыць ад іх складу. З сярэдзіны 1940 і да канца 1970-х гг. ажыццяўляўся шэраг агульнанацыянальных планаў і праграм, якія закраналі пытанні каардынацыі камплектавання фондаў замежнымі дакументамі. Сярод іх – Праект кааператыўнага камплектавання публікацый ваенных гадоў (1943–1948); Фармінгтонскі план камплектавання фондаў навуковых бібліятэк ЗША замежнай літаратурай (1947–1972); Праграма кааператыўнага камплектавання лацінаамерыканскай літаратурай (1960–1972) і інш.

Найбольшую вядомасць не толькі ў ЗША, але і ва ўсім свеце атрымаў Фармінгтонскі план, які з’явіўся першай спробай каардынацыі камплектавання замежных дакументаў у нацыянальным маштабе [15]. Асноўным аргументам, які стымуляваў яго распрацоўку, стаў нізкі ўзровень паўнаты паступлення новых замежных дакументаў у бібліятэкі краіны.

Паводле ацэнак спецыялістаў, галоўны недахоп, які прывёў да яго закрыцця, заключаўся ў неадпаведнасці паміж празмерна вялікай і складанай арганізацыяй працы (60 буйнейшых бібліятэк-удзельніц) і нізкай эфектыўнасцю (няпоўны ахоп краін, дакументы якіх павінны былі паступаць у бібліятэкі; вялікае дубліраванне літаратуры і інш.) [4]. Адной з прычын гэтай неадпаведнасці з’яўлялася тое, што размеркаванне галін ведаў паміж бібліятэкамі не адпавядала

асноўнаму профілю іх фондаў, гэта значыць план ускладаў на бібліятэкі дадатковыя кірункі камплектавання.

У 1949 г. у ЗША быў заснаваны Цэнтр навуковых бібліятэк як міжбібліятэчны цэнтр для 30 бібліятэк універсітэтаў і каледжаў Сярэдняга Захаду краіны. Мэтай Цэнтра з'явілася сумеснае фарміраванне бібліятэкамі аздінага фонду замежных дакументаў, што мала выкарыстоўваліся. Бібліятэкамі быў сфармуляваны план, які ўключаў чатыры асноўныя аспекты дзейнасці Цэнтра: каардынацыя фарміравання фондаў, цэнтралізаваная каталагізацыя, каапераціыя камплектавання і захоўвання дакументаў, якія мала выкарыстоўваюцца. Функцыі цэнтралізаванай каталагізацыі і каардынацыі фарміравання фондаў адразу аказаліся невыканальнымі. Аднак у 1951 г., калі Цэнтр стаў набываць дарагія дакументы, у праграму кааператыўнага камплектавання было ўключана раздзяленне адказнасці за падпіску на 40 замежных газет на мікраносьбітах. Распрацаваны пазней профіль фарміравання фонду Цэнтра дазволіў бібліятэкам-удзельніцам пазбягаць неапраўданага дубліравання дакументаў, якія мала выкарыстоўваліся. Да сярэдзіны 1960-х гг. Цэнтр з рэгіянальнай арганізацыі ператварыўся ў карпарацыю нацыянальнага маштабу, куды пачалі ўваходзіць усе навуковыя бібліятэкі [14].

У 1967 г. кіраўнікі 54 каледжаў і універсітэтаў штата Агаё заснавалі Бібліятэчны цэнтр каледжаў штата (OCLC) у мэтах арганізацыі аўтаматызаванай сістэмы, якая дазваляла б іх бібліятэкам сумесна фарміраваць і выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы і скараціць расходы. Асноўны напрамак кааперацыі бібліятэк ахапіў каталагізацыю дакументаў і ўзаемнае выкарыстанне бібліяграфічных запісаў [11], гэта значыць, непасрэдна каардынацыі фарміравання фондаў бібліятэк у рамках OCLC не прадугледжвалася. Тым не менш створаны ў 1971 г. Онлайнавы зводны каталог OCLC (OLUC) з'явіўся эфектыўным сродкам удакладнення профіляў фарміравання іх фондаў. Інакш кажучы, OCLC ускосна выконвае функцыю каардынатара.

Такім чынам, у выніку першых каардынацыйных пачынанняў бібліятэк ЗША ў галіне фарміравання фондаў у краіне афармілася мадэль каардынацыі фарміравання фондаў замежнымі дакументамі на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях. Ініцыятарамі і актыўнымі ўдзельнікамі каардынацыі з'ўляліся навуковыя бібліятэкі. Намецілася тэндэнцыя ажыццяўлення каардынацыі ў рамках аб'яднанняў і груп. Каардынацыя ў галіне фарміравання фондаў айчыннымі дакументамі прызнавалася менш значнай, і адпаведна яе развіццю бібліятэкі надавалі ёй другараднае значэнне.

У Вялікабрытаніі асноўны імпульс развіццю каардынацыі дала канферэнцыя па навуковай інфармацыі, якая адбылася ў 1948 г. [8].

Каардынацыя камплектавання, або кааператыўнае камплектаванне, фондаў бібліятэк ажыццяўлялася ў рамках рэгіянальных бібліятэчных сістэм. Усяго ў краіне налічвалася 11 рэгіянальных сістэм: Паўночная, Паўночна-Заходняя, Паўднёва-Усходняя і інш. У адну сістэму ўваходзіла ад 30 да 120 публічных і навуковых бібліятэк. На кожную сістэму распрацоўваліся планы кааператыўнага камплектавання. У аснове планаў былі розныя прынцыпы каардынацыі: галіновы, храналагічны, моўны, фармальны.

У Вялікабрытаніі развівалася каардынацыя камплектавання фондаў і на мясцовым (гарадскім) узроўні. Так, у 1948 г. 28 цэнтральных публічных бібліятэк Лондана склалі план галіновай спецыялізацыі для таго, каб дабіцца ахопу дакументаў па ўсіх галінах ведаў. Акрамя гэтага плана, у Лондане дзейнічалі яшчэ тры планы кааператыўнага камплектавання фондаў публічных бібліятэк, у аснову якіх быў пакладзены галіновы прынцып.

Агульнанацыянальны характар меў рэтраспектыўны план кааператыўнага камплектавання дакументаў, выдадзеных да 1800 г. У гэтым плане прымалі ўдзел каля 60 публічных, навуковых і спецыяльных бібліятэк. У аснове плана быў храналагічны прынцып: кожная бібліятэка збірала кнігі за пэўны, замацаваны за ёй перыяд часу [2].

Калі ў ЗША ініцыятарам каардынацыі з'явіліся навуковыя бібліятэкі, дык у Вялікабрытаніі – публічныя бібліятэкі. У адрозненне ад ЗША ў Вялікабрытаніі каардынацыя камплектавання распаўсюджвалася як на замежныя, так і на айчынныя дакументы. Прытым першараднае значэнне надавалася каардынацыі камплектавання айчыннымі дакументамі. Аднак з прычыны шэрага негатыўных фактараў бібліятэкі не змаглі поўнасцю ажыццявіць планы каардынацыі камплектавання фондаў. І адным з галоўных фактараў, у тым ліку і для бібліятэк ЗША, з'явілася тое, што каардынацыя дзейнасці бібліятэк Вялікабрытаніі не закранала профілі фарміравання фондаў і ажыццяўлялася ў дапаўненне да іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, супадзенне негатыўных бакоў у каардынацыі фарміравання фондаў бібліятэк Вялікабрытаніі і ЗША сведчыць аб тым, што гэтыя бібліятэкі рабілі адны і тыя ж памылкі ў развіцці дадзенага напрамку. Часткова такое становішча тлумачыцца імкненнем англійскіх бібліятэк да выкарыстання вопыту бібліятэк ЗША. Тым не менш у Вялікабрытаніі склалася свая мадэль каардынацыі фарміравання фондаў, якая ахоплівала замежныя і айчынныя дакументы і ажыццяўлялася на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях.

Каардынацыя дзейнасці бібліятэк у галіне фарміравання фондаў атрымала развіццё і ў краінах былой сацыялістычнай садружнасці: Венгрыі, Польшчы, Балгарыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы (ГДР) і інш. Абапіраючыся на вопыт ЗША, Вялікабрытаніі і іншых краін, бібліятэкі каардынавалі фарміраванне фондаў перш за ўсё замежнымі дакументамі і ў нацыянальным маштабе. Арганізацыйныя і метадычныя пытанні вырашаліся шляхам стварэння каардынацыйных планаў, зводных каталогаў і картатэк, камісій і метадычных саветаў і інш. У мэтах павышэння эфектыўнасці супрацоўніцтва некаторыя бібліятэкі аб'ядноўваліся ў розныя групы. Так, напрыклад, з 1968 г. у Венгрыі ствараліся кааператыўныя аб'яднанні навуковых і спецыялізаваных бібліятэк, у кожным з якіх фонды бібліятэк прафіляваліся па вызначаных галінах ведаў [1], гэта значыць, што каардынацыя ажыццяўлялася па галіновым прынцыпе.

У ГДР атрымала развіццё каардынацыя фарміравання фондаў навуковых бібліятэк. Яна мела тры формы: тэматычны план камплектавання фондаў бібліятэк; рабочыя садружнасці бібліятэк, якія збіралі дакументы па вызначанай галіне ведаў; рэгіянальныя аб'яднанні бібліятэк.

Першы агульнанацыянальны тэматычны план каардынацыі камплектавання фондаў у ГДР быў зацверджаны ў 1956 г. і тычыўся замежных дакументаў. У яго ўваходзілі бібліятэкі універсітэтаў, кожная з якіх адказвала за паўнату камплектавання дакументаў па адной ці некалькіх навуковых дысцыплінах і забяспечвала даступнасць гэтых дакументаў любому чытачу краіны. Дадзеная форма каардынацыі была прызнана найбольш эфектыўнай ва ўмовах ГДР.

Важнай умовай каардынацыі ў ГДР было правіла ўліку профіляў фарміравання фондаў бібліятэк пры размеркаванні паміж імі абавязкаў. Аднак у асобных выпадках некаторым бібліятэкам даручалася камплектаванне дакументаў па няпрофільных для іх дысцыплінах, што паўтарала методыку каардынацыі фарміравання фондаў бібліятэк ЗША, Вялікабрытаніі і Скандынаўскіх краін.

Такім чынам, у бібліятэках краін былой сацыялістычнай садружнасці акрэслілася мадэль каардынацыі фарміравання фондаў айчыннымі і замежнымі дакументамі, якая ажыццяўлялася на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях у розных формах.

Адзіным міжнародным праектам сумеснага фарміравання фондаў з'явіўся план каардынацыі камплектавання фондаў бібліятэк Скандынаўскіх краін (Швецыя, Данія, Нарвегія, Фінляндыя), вядомы пад назвай Скандыя-план (1965). Прадпасылкай стварэння Скандыя-плана паслужыла абмежаванасць унутранага рынку навуковых дакументаў Скандынавіі, што вяло да выдання прац скандынаўскіх вучоных на распаўсюджаных еўрапейскіх мовах за мяжой. Таму паступленні дакументаў на замежных мовах у навуковыя бібліятэкі краіны ў некалькі разоў перавышалі паступленні дакументаў на роднай мове [6].

Скандыя-план ахопліваў 15 бібліятэк і ўскладаў на кожную бібліятэку адказнасць у адпаведнасці з яе спецыялізацыяй і асноўнымі напрамкамі фарміравання фонду. Гэта значыць, што план улічваў профілі фарміравання фондаў бібліятэк і не абавязваў бібліятэкі дадаткова набываць дакументы, якія не адпавядалі іх профілю. Аднак такі ўсёабдымны праект было цяжка ажыццявіць у маштабах усёй Скандынавіі. Практычнай рэалізацыі Скандыя-план не атрымаў, таму што меў мноства слабых бакоў. Напрыклад, калі супрацоўніцтва універсітэцкіх і навуковых бібліятэк не выклікала вялікіх праблем, то прыцягнуць да супрацоўніцтва галіновыя бібліятэкі вузкага профілю (бібліятэкі канцэрнаў, прадпрыемстваў і інш.) было цяжка, паколькі гэтыя бібліятэкі ўтойвалі свае "камерцыйныя тайны" ад канкурэнтаў [3].

Такім чынам, у Скандынаўскіх краінах была распрацавана мадэль каардынацыі фарміравання фондаў бібліятэк замежнымі дакументамі на міжнародным узроўні.

На сучасным этапе (1990-я гг. – пачатак XXI ст.) рост друкаваных і электронных дакументаў і адначасовы рост цэн на іх ставяць праблему каардынацыі дзейнасці замежных бібліятэк у галіне фарміравання інфармацыйных рэсурсаў у ранг стратэгічных. Усё больш нацыянальных і паранацыянальных бібліятэк выказваюцца за ўзгодненае фарміраванне фондаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як паміж сабой, так і з іншымі бібліятэкамі і сумеснае забеспячэнне максімальнага ахопу айчынных дакументаў.

У пачатку 1990-х гг. Нацыянальная бібліятэка Аўстраліі ініцыявала канцэпцыю размеркаванага нацыянальнага бібліятэчнага фонду (РНБФ). Яна вылучыла прапанову аб кааперацыі камплектавання і выкарыстання бібліятэчных фондаў у маштабах усёй краіны і вызначыла РНБФ як кангламерат усіх фондаў, улічаных у базах даных, даступных карыстальнікам [10].

Інструментам фарміравання РНБФ з'яўляецца схема Conspectus RLG, распрацаваная ў канцы 1970-х гг. Амерыканскай бібліятэчнай асацыяцыяй (ALA) і Групай навуковых бібліятэк (RLG). Размеркаваны фонд, які фарміруецца па дадзенай схеме, уяўляе сабой сістэму ўзаемадзеяння бібліятэк у рамках каардынацыйных планаў фарміравання фондаў па галіновым прынцыпе: за кожнай бібліятэкай замацоўваецца абавязак камплектавання і захоўвання найбольш поўнага збору айчынных і (або) замежных дакументаў па профільным для яе напрамку. Праект характарызуе гарызантальную мадэль РНБФ, гэта значыць, што ў фарміраванні размеркаванага фонду ўдзельнічаюць толькі буйныя бібліятэкі, якія валодаюць значным у агульнанацыянальным маштабе зборам дакументаў [9].

Іншым падыходам каардынацыі з'яўляецца "палітыка раздзеленага фарміравання фондаў". У ЗША Нацыянальная сельскагаспадарчая бібліятэка і Нацыянальная медыцынская бібліятэка маюць пагадненні аб раздзяленні абавязкаў і нацыянальнай адказнасці па фарміраванні фондаў айчыннымі і замежнымі дакументамі ў галіне ветэрынарнай медыцыны, грамадскага харчавання і сучаснай біятэхналогіі [7, с. 450–451].

У Францыі Нацыянальная бібліятэка заключае пагадненні са спецыяльнымі галіновымі бібліятэкамі. Апошнія бяруць на сябе абавязацельствы камплектаваць дакументы па сваім асноўным профілі, дапаўняючы фонды Нацыянальнай бібліятэкі.

Брытанская бібліятэка раздзяляе адказнасць за архіўнае захоўванне мясцовых і рэгіянальных дакументаў з нацыянальнымі бібліятэкамі Шатландыі, Паўночнай Ірландыі і Уэльса [13].

Хоць сучасныя сродкі тэлекамунікацый і даюць аператыўны доступ да інфармацыйных рэсурсаў, але пакуль што вартасць гэтага доступу для бібліятэк у замежных краінах з'яўляецца высокай. Таму ўзнікае неабходнасць каардынацыі дзейнасці бібліятэк у галіне фарміравання інфармацыйных рэсурсаў у аддаленым рэжыме. Такая каардынацыя ажыццяўляецца ў рамках кансорцыумаў.

У Вялікабрытаніі існуюць Кансорцыум навуковых універсітэцкіх бібліятэк (Consortium of University Research Libraries), Кансорцыум юрыдычных бібліятэк Новай Англіі (New England Law Library Consortium) і інш.; у Канадзе – Медыцынскі кансорцыум у Таронта (The Health Science Information Consortium of Toronto) і інш.; у Швейцарыі – Кансорцыум навуковых бібліятэк Швейцарыі (Consortium of Swiss Academic Libraries) і інш.

Значная колькасць кансорцыумаў функцыянуюць у ЗША. Буйнейшымі з іх з'яўляюцца Асацыяцыя паўднёва-ўсходніх даследчых бібліятэк (Association of Southeastern Research Libraries), Кансорцыум бібліятэк штата Тэнесі (TENN-SHARE), Кансорцыум навуковых бібліятэк штата Юта (Utah Academic Library Consortium) і інш. Кансорцыумы развіваюцца не толькі на нацыянальным, але і на міжнародным узроўні.

У 1999 г. па ініцыятыве Фонду Сораса пачалася праца па стварэнні міжнароднага кансорцыума eIFL Direct (Electronic Information for Libraries Direct), мэтамі якога з'яўляюцца забеспячэнне шырокім слаям насельніцтва адкрытага доступу да сусветных баз даных, а таксама істотнае зніжэнне вартасці доступу да інфармацыйных рэсурсаў для ўсіх краін-удзельніц кансорцыума. На першым этапе ў кансорцыум увайшлі 39 краін на тэрыторыі Усходняй Еўропы, Азіі і Афрыкі. У канцы 2002 г. бібліятэкі атрымалі доступ да больш чым 5000 электронных часопісаў як праз інтэрнет, так і на CD/DVD-фарматах [5].

У 1997 г. была створана Міжнародная кааліцыя бібліятэчных кансорцыумаў (ICOLC), якая аб'ядноўвае каля 150 кансорцыумаў з ЗША, Канады, Вялікабрытаніі, Нідэрландаў, Германіі, Аўстраліі і іншых краін. Кааліцыя спрашчае дыскусіі кансорцыумаў па пытаннях, якія выклікаюць іх узаемны інтарэс [12].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што на сучасным этапе існуе мадэль каардынацыі фарміравання айчынных і замежных інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк, якая ажыццяўляецца на міжнародным, нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях. Каардынацыя мае розныя арганізацыйныя формы.

Такім чынам, у замежных краінах на пачатковым этапе развіцця каардынацыі дзейнасці бібліятэк у галіне фарміравання інфармацыйных рэсурсаў аформіліся мадэлі каардынацыі фарміравання фондаў бібліятэк замежнымі дакументамі і мадэлі каардынацыі фарміравання фондаў бібліятэк айчыннымі і замежнымі дакументамі. На сучасным этапе склалася мадэль каардынацыі фарміравання айчынных і замежных інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк. Па вызначанай прымеце гэтыя мадэлі адносяцца да мадэляў фармальнага тыпу. Акрамя таго, акрэсленыя тэрытарыяльныя маштабы каардынацыі на пачатковым і сучасным этапах (міжнародны, нацыянальны, рэгіянальны, мясцовы) дазваляюць аднесці названыя мадэлі да мадэляў тэрытарыяльнага тыпу.

Каардынацыя фарміравання інфармацыйных рэсурсаў у гэтыя перыяды ажыццяўляецца паміж бібліятэкамі як аднаго, так і розных тыпаў, што дае падставу вылучыць арганізацыйныя мадэлі каардынацыі. У аснову большасці планаў каардынацыі пакладзены галіновы прынцып, што, у сваю чаргу, дазваляе вылучыць галіновыя мадэлі каардынацыі фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк.

---

1. *Арефьева, Е.П.* Координация комплектования библиотечных фондов [Текст]: лекция по курсу “Библиотечные фонды” для студ. библ. фак. / Е.П.Арефьева; Моск. гос. ин-т культуры. – М., 1978. – 52 с.

2. *Балдина, И.В.* Кооперативное комплектование массовых и научных библиотек Великобритании / И.В.Балдина // Библиотековед. и библиогр. за рубежом. – 1960. – Вып. 6. – С. 105–118.

3. *Мирный, С.М.* Координация комплектования иностранной литературой научных библиотек Скандинавских стран / С.М.Мирный // Библиотековед. и библиогр. за рубежом. – 1960. – Вып. 6. – С. 119–130.

4. *Оськина, В.М.* Фармингтонский план комплектования фондов научных библиотек США иностранной литературой / В.М.Оськина // Библиотековед. и библиогр. за рубежом. – 1960. – Вып. 6. – С. 131–141.

5. *Рахматуллаев, М.* Узбекистан в Международном консорциуме eIFL [Электронный ресурс] / М. Рахматуллаев // Компас. – Электрон. журн. – 2002. – № 3(6). – Режим доступа: http://kompas.uz/issues/6-2002/eifl.php. – Загл. с экрана.

6. *Amundsen, V.* Muligheder for samarbejbe mellem de nordiske landsburgsbiblioteker / V.Amundsen // Tidskrift for dokumentation. – 1956. – № 4. – P. 45–54.

7. *Elder, N.J.* Collection Development, Selection? And Acquisition of Agricultural Materials / N.J.Elder, B.G.Hobrock, D.L.Madsen, W.H.Wiese // Libr. Trends. – 1990. – Vol. 38, № 3. – P. 442–473.

8. *Filon, S.P.Z.* Library cooperation: the general situation / S.P.Z.Filon // Libr. Assoc. Records. – 1956. – Vol. 58, № 6. – P. 57–64.

9. *Henty, M.* Resource sharing among Australian libraries: a distributed national collection / M.Henty // Libr. acquis. – 1993. – № 17. – P. 311–317.

10. *Henty, M.* Resource sharing ideals and realities: the case of Australia’s distributed national collection / M.Henty // Advances in Collect. Develop. and Sharing. – 1995. – Vol. 1, № 6. – P. 139–152.

11. *History* of OCLC [Electronic resource] / Online Computer Library Center. – Electronic data (1 file). – Dublin: OCLC, 2003. – Mode of access: http://www.oclc.org/about/history. – Title from screen. – Eng.

12. *International* Coalition of Library Consortia ICOLC [Electronic resource] / Yale University Library. – Electronic data (1 file). – Yale: ICOLC, 2003. – Mode of access: http://www.library.yale.edu/consortia. – Title from screen. – Eng.

13. *The British* library 24$^{th}$ annual report, 1996–1997. – London. – 100 p.

14. *The Center* for Research Libraries: Historical Background to 1980 [Electronic resource] / Center for Research Libraries. – Electronic data (1 file). – Chicago: CRL, 2002. – Mode of access: http://wwwcrl.uchicago.edu. – Title from screen. – Engl.

15. *Williams, E.E.* Farmington Plan Handbook / E.E.Williams. – Cambr.–Massach., 1953. – 170 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ